***Узнікненне першых музеяў на Беларусі было звязана з асветніцкім характарам збораў музейнага значэння, развіццём і дыферэнцыяцыяй навук. Вывучэнне, музеефікацыя, кансервацыя і рэстаўрацыя твораў мастацтва – тэарэтычная і практычная праблема мастацтвазнаўства, гісторыі і музеязнаўства.***

***Зборы музеяў пашыраюць кругагляд, выхоўваюць мастацкі густ, пабуджаюць да ўдзелу ў даследаванні гісторыі і прыроды краю, дапамагаюць наведвальнікам зразумець, што дзяржаўнасць і культура Беларусі маюць глыбокія самабытныя і адначасова агульныя еўрапейскія карані. Шматгадовая і шматгранная праца беларускіх даследчыкаў і музейных работнікаў дазваляе назапашваць багатыя музейныя зборы, арганізоўваць тэматычныя выставы, ствараць змястоўныя каталогі, сярод якіх – каталог сярэднявечных тканін Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка. Каталагізацыя твораў беларускага мастацкага тэкстылю несумненна паспрыяе пашырэнню ведаў пра Беларусь, культуру і мастацтва нашай краіны ў свеце, дазволіць грунтоўна даследаваць і прааналізаваць многія пытанні, звязаныя з гісторыяй тэкстылю і касцюма, што ў сваю чаргу паспрыяе развіццю беларускага мастацтва і культуры.***

**УДК 745.52.033(476)**

# КАТАЛАГІЗАЦЫЯ ТЭКСТЫЛЬНЫХ МАСТАЦКІХ ТВОРАЎ БЕЛАРУСІ
## (ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ)

***канд. мастацтвазнаўства, дац. Г.А. БАРВЕНАВА***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск)***

*Каталагізацыя твораў тэкстыльнага мастацтва – ад археалагічных фрагментаў тканін, захаваных узораў нітак і сярэднявечных ткацкіх прыладаў да камплектаў адзення ХХ стагоддзя – дазваляе прасачыць уплыў ткацтва на працэс развіцця мастацтва Беларусі, увогуле спрыяе тэарэтычнаму вывучэнню, папулярызацыі і пашырэнню ведаў пра беларускую матэрыяльную, мастацкую і духоўную культуру шляхам тлумачэння высокай мастацкай вартасці тэкстыльных помнікаў. У артыкуле творы мастацкага тэкстылю з беларускіх музейных збораў падзяляюцца на групы і тыпы, акрэсліваюцца праблемы іх экспанавання і захавання. Аналіз экспанатаў з музейных збораў і тэкставых паведамленняў да іх у спалучэнні з пісьмовымі і іканаграфічнымі крыніцамі дазволіў прасачыць генезіс, даследаваць тыпалогію, асэнсаваць сімволіку і семантыку беларускага тэкстыльнага мастацтва мінулага тысячагоддзя. Навуковае даследаванне закладзеных у Сярэднявеччы тэкстыльных традыцый дае магчымасць іх пераасэнсавання, убачыць пераемнасць у наступных стагоддзях.*

У экспазіцыях і фондах музеяў Беларусі захоўваюцца багатыя калекцыі кампанентаў рэлігійнага ўбрання, свецкага адзення, археалагічныя фрагменты тканін, узоры карыстаных у Сярэднявеччы нітак, прылады старажытнай ткацкай вытворчасці і інш. Вывучэнне гэтых калекцый дазваляе прасачыць генезіс, даследаваць тыпалогію, асэнсаваць сімволіку і семантыку беларускага тэкстыльнага мастацтва мінулага тысячагоддзя. Асобныя музейныя экспазіцыі або музеі цалкам прысвечаны традыцыйнаму беларускаму ткацтву і народнаму строю, у іх дэманструецца тэкстыль, адзенне і ткацкія прылады XIX – першай паловы XX стагоддзя. У музейных экспазіцыях (літаратурных, гістарычных, вайсковых, мемарыяльных), прысвечаных найноўшаму часу, дэманструецца адзенне або аксэсуары (пальчаткі, упрыгожанні, узнагароды і т.п.) вядомых пісьменнікаў, артыстаў, вайсковых, палітычных і грамадскіх дзеячоў. Аднак не ўсе творы мастацкага тэкстылю з музейных калекцый з'яўляюцца прадметам навуковых даследаванняў, далёка не ўсе з іх каталагізаваны.

**Асноўная частка.** Творы традыцыйнага беларускага ткацтва і ўзоры народнага адзення звычайна з'яўляюцца асноўным візуальным матэрыялам шматлікіх музейных экспазіцый на Беларусі. Гэта тычыцца як буйных дзяржаўных музеяў, так і школьных або прыватных, што само па сабе дэманструе імкненне захаваць аўтэнтычныя творы мастацтва і асаблівую пашану да іх. У канцэпцыю некаторых музейных збораў пакладзена калекцыянаванне тыпаў і рэгіянальных адметнасцяў беларускага народнага адзення, святочнага строю, абрадавых ручнікоў, традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва Беларусі (Музей старажытна-беларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі) [8]. Народнае ўзорнае

ткацтва працягвае выконваць сваю сімвалічную і ўжытковую ролю ў натуральным для яго асяродку – хаты (Музей традыцыйнай беларускай архітэктуры і побыту). Экспазіцыі шэрага музеяў арганізаваны як аповед пра асаблівасці аўтэнтычнай тэкстыльнай традыцыі пэўнага рэгіёну [4; 12]. Напрыклад, у Музеі традыцыйнага ткацтва Паазер’я наведвальнік далучаецца да таямніц светаўспрымання нашых продкаў, да Дрэва Сусвету шляхам разумення ўсіх этапаў вырабу тканіны. Экспазіцыя апавядае пра вырошчванне ільну, сакрэты апрацоўкі валакна, спосабы кручэння нітак і, нарэшце, пра шэдэўры традыцыйнага ўзорнага ткацтва, пляцення і вышыўкі, пра ролю рытуальных тканін у каляндарнай і сямейнай абраднасці беларусаў. Шматгадовая і шматгранная праца беларускіх даследчыкаў і музейных работнікаў дазваляе назапашваць багатыя музейныя зборы, ствараць змястоўныя каталогі, арганізоўваць тэматычныя выставы. Дзякуючы гэтай працы плённа вывучаецца сімволіка і семантыка традыцыйных арнаментаў, ткацкіх твораў, якія разглядаюцца навукоўцамі ў непарыўнай сувязі з абрадамі і рытуальнымі словамі [1]. Многія з твораў традыцыйнага ўзорнага ткацтва прааналізаваны ў манаграфіях, адлюстраваны ў каталогах, музейных праспектах, рэкламна-інфармацыйных матэрыялах [3; 7; 8; 10; 11; 13; 14; 16].

Рэдкімі і каштоўнымі экспанатамі традыцыйнага ткацтва з’яўляюцца тэкстыльныя творы, якія былі сабраны краязнаўцамі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя [20]. Сярод унікальных музейных збораў – калекцыя Віцебскага абласнога краязнаўчага музея, у якой ілюструецца варыятыўнасць ткацкага рамяства пэўнага рэгіёну, аднаго пакалення, адной майстрыхі. Фрагменты тканін, сабраных у 1925 – 1926 гадах у Гарадоцкім раёне, апавядаюць пра ўзорнае ткацтва, тыпы пляцення, кручэння ніткі, спосабы апрацоўкі палатна і яго афарбоўкі. Узоры рознаварыянтных тканін, радзей з вышыўкай, збіраліся вучнямі ў сем’ях і перадаваліся настаўніку-краязнаўцу. Прынесеныя кожным вучнем тканіны (звычайна па 7 – 10 фрагментаў) замацоўваліся на картон. Вось прыклад подпісу да аднаго з картонаў: «Ткані па вёсках Гарадокскага р-на, в. Хобнішча Мішневіцкага с/с. Сабраны вучнем IV класа Я. Зуевым, работа яго маці Я. Логінавай». Тканіны на картонах вызначаюцца якасцю і каларытам, сведчаць пра індывідуальнасць і густ майстрых, прычым рэдкія тканіны, вытканыя ў суседніх вёсках, ідэнтычныя. Калекцыя сведчыць, што тэхналогія вырабу тканін перадавалася праз стагоддзі – тыпы палатнянага, саржавага, ламанага саржавага пляценняў маюць аналогіі з тканінамі XII стагоддзя, тканіны валеныя з воўны, узоры складанага саржавага пляцення аналагічныя тканінам канца XV стагоддзя (мал. 1, 2).



Мал. 1. Тканіна ільняная (адзенне каталіцкага святара). XIV ст. Хэдхайм. Касцёл святога Гадэхарда [25, іл. 41 – 42]



Мал. 2. Тканіна ільняная. 1925 г., в. Хобні Пальмінскага с/с Гарадоцкага р-на. Віцебскі абласны краязнаўчы музей

У другую па колькасці групу экспанатаў мастацкага ткацтва (пасля твораў народнага мастацтва) уваходзіць тэкстыль X – XIX стагоддзяў. Еўрапейскія музеі найчасцей экспануюць мастацкі тэкстыль, які стагоддзямі захоўваўся ў касцёльных скарбніцах, у замкавых і палацавых калекцыях. Сёння закрыстыі многіх касцёлаў з рэліквіямі храмаў і парафій даступныя наведвальнікам [23, с. 9; 28]. Напрыклад, у закрыстыі Сабора парыжскай Маці Божай захоўваецца кашуля караля Святога Луі (1214 – 1226 – 1270), у якой ён каяўся перад алтаром храма за грахі, а таксама арнаты і галаўныя ўборы святароў эпохі Сярэднявечча, Барока, Ракако, арнаты і альбы пап і кардыналаў XX стагоддзя, прычым кожны з гэтых тэкстыльных твораў – узор мастацтва сваёй эпохі. Музейныя тэкстыльныя калекцыі і сёння ўзбагачаюцца высокамастацкімі і сімвалічнымі дарункамі. Напрыклад, музею на Вавелі, папа Ян Павел II ахвяраваў кампаненты свайго ўбрання. Гэтыя высокамастацкія тэкстыльныя творы пачатку XXI стагоддзя дадалі пашаны і святасці храма, кляштара. Закрыстыі буйных касцёлаў Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX стагоддзя таксама выконвалі ролю музеяў, там выстаўляліся не толькі культавыя рэчы (рэліквіі, святочнае ўбранне святароў, культавы посуд), але і археалагічныя знаходкі, партрэты і інш. Своечасова і надзейна схаваныя ў 1939 годзе храмавыя калекцыі ў апошнія дзесяцігоддзі адкрываюцца, вывучаюцца навукоўцамі, каталагізуюцца і

пасля гэтага экспануюцца як на радзіме, так і за яе межамі. Больш за 30 святарскіх убранняў другой паловы XV – XIX стагоддзя, сотні каштоўных кубкаў, паціраў, цыборыюмаў, пярсцёнкаў і інш., захаваных у ідэальным стане, апавядаюць пра багацце Віленскай катэдры (мал. 3). Многія з экспанатаў захоўваліся ў Археалагічным музеі ў Вільні, з'яўляліся фундушамі Сапегаў, Радзівілаў, іншых магнатаў розным касцёлам і цэрквам Беларусі і Вільні [27].



Мал. 3. Капа. Аксамітны бракат. Шаўковыя і залачоныя срэбныя ніткі. Ткацтва, вышыўка. Італія.
Канец XV – першая палова XVI ст. Падшыўка: ільняное палатно, тканыя галуны. Першая палова XIX ст.
Музей Архідэцэзіальны ў Вільне [27, с. 122]

Варта тут закрануць пытанне права ўласнасці на творы мастацтва. У еўрапейскай практыцы, калі абраз, капа, пацір, кніга, любы іншы твор мастацтва экспануецца ў музеі, але не быў ім выкуплены, твор застаецца ва ўласнасці кляштара, касцёла, царквы, што і адлюстроўваецца ў суправаджальнай дакументацыі і подпісах да экспаната [22; 29; 30]. Кляштарныя майстэрні, у якіх з захаваннем традыцый вырабляецца сучаснае культавае ўбранне, выконваецца мастацкае шыццё і аздоба вышыўкай, дапамагаюць музеям рэстаўраваць творы мастацтва або кантралююць рэстаўрацыю. Беларусі, верагодна, сёння варта было б успрыняць такую еўрапейскую практыку. Гэта палагодзіла б канфліктныя адносіны музеяў і храмаў адносна вяртання каштоўнасцей, а царкоўныя творы маглі б захоўвацца і экспанавацца; супольная праца майстроў розных канфесій і рэстаўратараў паспрыяла б адраджэнню мастацтва беларускага гафта, школы беларускіх абразоў і інш.

У дадзенай групе тэкстыльных твораў каталагізаваны і апісаны слуцкія паясы і іх фрагменты, якія захоўваюцца ў музеях Беларусі, Польшчы, Расіі, шматлікіх калекцыях свету. Дзякуючы намаганням супрацоўнікаў Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі, Нацыянальнага мастацкага музея (найперш Н. Высоцкай, І. Скварцовай), Музея старажытнабеларускай культуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі, іншых музеяў праведзена атрыбуцыя, сістэматызацыя, тыпалагізацыя твораў, якія захоўваюцца ў розных музеях Беларусі. Даволі поўнаму ўяўленню як вырабляліся і выкарыстоўваліся ў адзенні слуцкія паясы дапамагаюць тэматычныя выставы, якія з ухвальнай перыядычнасцю адбываюцца ў музеях Беларусі і Польшчы, адмысловыя навуковыя даследаванні, прысвечаныя гэтай мастацкай з'яве [5].

Не так пазітыўна выглядае справа з археалагічным тэкстыльным матэрыялам. У экспазіцыях і сховішчах археалагічных, краязнаўчых і іншых музеяў Беларусі захоўваюцца фрагменты тканін, адзення, ткацкіх прылад, знойдзеных падчас археалагічных раскопак у гарадах і шматлікіх курганах [2]. Найбольш каштоўнымі і значнымі для вывучэння гісторыі адзення, побыту, культуры старажытнабеларускіх княстваў з'яўляюцца знаходкі ў пахаваннях эліты грамадства (храмавыя пахаванні, багатыя курганы). На жаль, такія знаходкі рэдка падаюцца ў музеях як комплекс. Часцей яны падзяляюцца па відах мастацтва і разыходзяцца па розных стэндах, нярэдка нават у розныя музеі.

Напрыклад, у 1949 – 1951 гадах падчас раскопак на тэрыторыі Мінскага замчышча ў крыпце Мінскага замкавага храма было выяўлена 21 пахаванне ў дамавінах. У прыалтарнай частцы паўночнай бакавой абсіды Мінскага храма было знойдзена пахаванне князёўны 14 – 17-гадовага ўзросту. Пахаванне датавалі не пазней другой паловы XII стагоддзя [15]. Жаночае пахаванне знаходзілася ў надзвычай добрым стане: захаваліся валасы, разам з тканінай заплеценыя ў дзьве касы і ўскладзеныя вакол галавы, карона-вяночак (лац. corona – вянок) з рэльефным раслінным арнаментам з парчы, вянок з кветак птармікі, ручніковы покрыў з лёгкай паўпразрыстай тканіны белага колеру. У пахаванні была выяўлена ўнікальная знаходка – сімвал княжацкай улады, наплечча. Гэта круглы вялікі каўнер, для жорсткасці меў скураную аснову, паверх якой была нацягнута каштоўная тканіна з буйнымі срэбнымі эмалевымі накладкамі, каштоўнымі камянямі і перлінамі. З адзення захавалася скураная падкладка наплечча (аплечча, барма), з прымацаванымі да яго металічнымі (медзянымі ці бронзавымі, мяркуючы па зеленаватай вокісі) аздобамі, рэшткі ваўнянай тканіны адзення; на нагах – мяккія востраносыя чаравікі з чорнай скуры са скуранымі ж матузкамі і прарэзным арнаментам. Адкрыццё пахавання дазволіла з дакладнасцю рэканструяваць парадна-цырыманіяльны строй беларускай князёўны. Падобныя строі насілі князёўны ўсіх стара-

жытнабеларускіх княстваў, што пацвярджаюць мініяцюры з «Кодэксу Гертруды» і «Радзівілаўскага летапісу», выявы на крыжы Еўфрасінні Полацкай, абразок «Канстанцін і Алена», пячаткі князёў, фрэскі.

Апісанае вышэй пахаванне мінскай князёўны страчана, раскамплектавана: косці перайшлі ў фонды Інстытута гісторыі НАН Беларусі, металічныя нашыўкі, фрагменты тканіны, абутак разышліся па розных музеях Мінска. Альбом-дадатак да справаздачы (фотаздымкі, замалёўкі і г.д.) значыцца ў фондзе Інстытута гісторыі, але адсутнічае. І гэта пры тым, што на тэрыторыі Еўропы княжацкія пахаванні часоў Сярэднявечча адзінкавыя. Дзеля параўнання: у Кракаве на Вавелі храмавага пахавання гэтага перыяду не выяўлена ніводнага, безінвентарнае пахаванне хлопчыка каля храма стала часткай сучаснай музейнай экспазіцыі «Страчаны Вавель». Вывучэнне пахавальных комплексаў эліты грамадства (старажытных Егіпта, Ізраіля, Грэцыі, Рыма, ранніх еўрапейскіх дзяржаў і інш.) – адна з важнейшых тэм археалагічных і навуковых даследаванняў у Еўропе XIX – XX стагоддзяў. Музейныя экспазіцыі, арганізаваныя ў выніку такіх даследаванняў, з’яўляюцца значным кампанентам турыстычнай інфраструктуры ў многіх краінах.

А як дэманструюцца ўнікальныя пахавальныя комплексы ў музейных экспазіцыях у суседніх краінах? Напрыклад, адна з залаў Кіеўскага музея гістарычных каштоўнасцяў апавядае пра багацце скіфскай цывілізацыі. З гэтай залы наведвальнік трапляе ў вялікае памяшканне-склеп, у цэнтры якога ў вялікім шкляным саркафагу, на стылізаваным кургане ляжыць скіфская царыца ў парадным строі. Пры стварэнні экспазіцыі музейныя супрацоўнікі, археолагі, мастацтвазнаўцы імкнуліся перадаць унікальнасць знаходкі, захаваць кожны фрагмент шкілета, кожную залатую нашыўку галаўнога ўбору, плашча, тунікі, уладкаваць бранзалеты і пярсцёнкі дакладна там, дзе яны былі выяўлены падчас раскопак. Стэнды апавядаюць пра духоўную, мастацкую і матэрыяльную культуру скіфскай цывілізацыі. У экспазіцыі дэманструюцца графічныя рэканструкцыі адзення, а таксама выкананыя ў матэрыяле рэканструкцыі кампанентаў строю скіфскай царыцы, у прыватнасці, аксамітная шапачка, на якой шэрагамі размешчаны нашыўкі [6]. На аснове каралеўскіх і вялікакняжацкіх пахаванняў Вялікага княства Літоўскага і Каралеўства Польскага, адкрытых у пачатку XX стагоддзя (Вавель; Кафедральны сабор у Вільні [31]), мастацтвазнаўцамі і гісторыкамі створана цэльная карціна цырыманіялаў, знакаў вышэйшай улады (інсігній), строяў і тэкстылю XV – XVIII стагоддзяў. За апошнія дзесяцігоддзі польскія даследчыкі на аснове вывучэння рэгіянальных крыптавых пахаванняў XVII – XVIII стагоддзяў змаглі прааналізаваць імпартаваны і польскі тэкстыль, асаблівасці кравецтва, кампанентнасць строю, узроставыя асаблівасці ў адзенні. Тэарэтычныя даследаванні, праца рэстаўратараў і кансерватараў дазволілі абнавіць музейныя экспазіцыі, узбагаціць іх рэканструкцыямі строяў. Пра значнасць тэматыкі, узровень даследаванняў, якасць рэстаўрацыі і кансервацыі тэкстылю і строяў гаворыць той факт, што праца Алены Дранжкоўскай «Пахавальнае адзенне ў Рэчы Паспалітай у XVII і XVIII стагоддзях» была прызнана лепшым навуковым даследаваннем канца XX стагоддзя ў Польшчы [18].

У выніку археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі ў адкрытых храмавых і курганных пахаваннях, у культурных пластах гарадоў былі знойдзены разнастайныя рэшткі адзення, галаўных убораў, паясоў, упрыгожанняў, абутку, ткацкіх прылад працы, астэалагічны матэрыял. Узоры шаўковых, ільняных і ваўняных тканін, выяўленых на тэрыторыі рэспублікі, захоўваюцца ў музейных калекцыях Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны і інш. Далёка не ўсе гэтыя тканіны дэманструюцца ў экспазіцыях, а калі і дэманструюцца, дык не заўсёды карэктна, не ўсе яны прайшлі тэхналагічную апрацоўку. З цягам часу выяўленыя археолагамі тканіны разбураюцца, блякне іх колер, таму тэкстыльныя археалагічныя знаходкі патрабуюць адмысловай апрацоўкі, падчас якой аналізуецца тэкстура тканіны, яе арнаментыка і пляценне, даследуюцца склад нітак і фарбавальнікі. Пасля гэтага фрагмент рэстаўруецца і кансервуецца ў рэстаўрацыйных майстэрнях для музейнага экспанавання [19; 21]. На жаль, шмат унікальных тканін, знойдзеных на беларускіх землях, дагэтуль чакаюць сваёй апрацоўкі, або ўжо беззваротна страчаны. Ёсць і іншыя цяжкасці. У археалагічных справаздачах інфармацыя пра выяўленыя тэкстыльныя фрагменты носіць выключна статыстычны характар, таму па гэтых матэрыялах вельмі цяжка аналізаваць тканіны, іх пляценне, арнаментыку, каларыстыку, вызначаць месцы нашывак і ўпрыгожанняў. Фотаздымкі тэкстыльных фрагментаў амаль не сустракаюцца ў археалагічных манаграфіях. Выяўленыя падчас раскопак нашыўкі, пярсцёнкі, бранзалеты, гузікі, фрагменты тканіны патрабуюць дакладнага апісання, фотафіксацыі, а галоўнае – захавання ўсяго пахавальнага комплексу, што з’яўляецца перадумовай вывучэння адзення розных сацыяльных груп і ў розныя часы. Пры гэтым менавіта тканіны і ўпрыгожанні – візуальны паказчык узроўню развіцця матэрыяльнай культуры і мастацкай творчасці беларускага народа, яго рэлігійных поглядаў, культурных і гандлёвых сувязяў краіны.

У фондах беларускіх музеяў захоўваюцца ўзоры тэкстылю і кампаненты строяў XVII – XIX стагоддзяў. У прыватнасці, кампаненты святарскага ўбрання і ўзоры храмавага тэкстылю (арнат, далматыка, антэпендыюм, прэтэкста арната, інфула, капа, алтарная заслона, харугва), інтэр’ерныя тканіны (шпалера, абрус), кампаненты свецкага адзення (рукавы, ліф), аксэсуары (веер, радыкюль, шаль, металічныя і скураныя паясы, эпалеты). Аксэсуары (шалі, вееры і інш.) на Беларусі пакуль не сталі тэмай асобнага вывучэння і каталагізацыі, хаця ў еўрапейскім мастацтвазнаўстве такія даследаванні вядуцца даволі шырока і ўжо дазволілі назапасіць багаты матэрыял [26]. У еўрапейскіх музейных экспазіцыях строй або яго кампаненты нярэдка дэманструюцца разам з партрэтамі, адпаведнай мэбляй і прадметамі штодзённага ўжытку,

што дазваляе найбольш дакладна перадаць культуру пэўнай эпохі [17; 24]. Знакамітыя музеі з багатымі тэкстыльнымі калекцыямі арганізуюць вялікія тэматычныя экспазіцыі, напрыклад, выстава «Касцюм эпохі Пятра I» у Эрмітажы.

У музейных экспазіцыях Беларусі і раней існавала практыка рэканструкцый гістарычнага адзення, абмежаваная, аднак, выключна ўвагай да партызанскага руху, а таксама ўніформай савецкіх і нямецкіх вайскоўцаў (на нашу думку, з увагі на ўсе акалічнасці акупацыі на Беларусі, гэтая практыка не можа лічыцца дарэшты вычарпанай). Аднаўленне незалежнасці Беларусі ў 1991 годзе з непазбежнасцю прымусіла звярнуць увагу на ўвесь гістарычны шлях краіны. Музеі Беларусі пачалі выкарыстоўваць у экспазіцыях рэканструкцыі адзення розных часоў і розных сацыяльных груп грамадства. Рэканструкцыі касцюмаў гараджан XI – XIII стагоддзяў (Музей «Бярэсце»), шляхціца і шляхцянкі эпохі Рэнэсанса XVI стагоддзя, бурмістра, лаўнікаў і пісара Магілёўскага магістрата XVII стагоддзя (Барвенава Г.А., Музей гісторыі Магілёва, мал. 4), князя і княгіні эпохі Барока (Піскун Ю.А., Замкавы комплекс Мір), кнігадрукароў пачатку XVI стагоддзя (Музей беларускага кнігадрукавання ў Полацку) дапамагаюць наведнікам музеяў зразумець, што дзяржаўнасць і культура Беларусі маюць глыбокія самабытныя і адначасна агульныя еўрапейскія карані. Такія рэканструкцыі ствараюцца на падставе глыбокіх тэарэтычных ведаў у галіне гісторыі ткацтва і тэкстылю. Перад стварэннем рэканструкцый іх аўтары (даследчыкі гісторыі касцюма, мастакі-дызайнеры і мастацтвазнаўцы) праводзяць грунтоўную навуковую працу, аналізуюць тканіны, упрыгожанні, што захоўваюцца ў музеях, а таксама партрэты, абразы, пісьмовыя крыніцы і інш. Аўтары рэканструкцый замаўляюць або падбіраюць тканіны, якія па фактуры, арнаментыцы, колеру і пляценню блізка супадаюць з прататыпам. Рэканструктары мусяць паўтарыць крый, тэхніку шыцця, вышыўку, дэкор – такая праца патрабуе грунтоўных ведаў, майстэрства, часу.

 

Мал. 4. Мужчынскі і жаночы шляхецкі строй Вялікага княства Літоўскага пачатку XVI ст.
Рэканструкцыя Г.А. Барвенавай. Сталая экспазіцыя «Магілёў часоў прыняцця Магдэбургскага права»
ў Музеі гісторыі Магілёва

Асобную групу твораў тэкстыльнага мастацтва складаюць сцэнічныя касцюмы і бутафорыя, а таксама эскізы сцэнічных касцюмаў. Знакамітыя еўрапейскія тэатры маюць свае музейныя экспазіцыі, якія дэманструюць касцюмы, дэкарацыі, эскізы да вядомых пастановак. Музеі касцюма, бутафорыі і рэквізіту маюць і знакамітыя кінастудыі. Эскізы да вядомых пастановак і сцэнічныя касцюмы з’яўляюцца асновай экспазіцый рухомых выстаў, прысвечаных тэатральнаму і кінамастацтву Францыі, ЗША, Англіі, Кітая і інш. У савецкія часы існавала практыка ўтылізацыі касцюмаў і бутафорыі, іх павінны былі «парэзаць» пасля таго, як фільм выйшаў у пракат або спектакль здымаўся з рэпертуара. Але далёка не ўсе тэатры былога СССР слепа выконвалі гэта, касцюмы і рэквізіт часткова пакідаліся, таму сёння ствараюцца музеі і музейныя экспазіцыі, якія дэманструюць, напрыклад, касцюмы пастановак Марыінскага тэатра пачынаючы з 20-х гадоў XX стагоддзя. На Беларусі толькі дзякуючы ініцыятыве некаторых мастакоў-пастаноўшчыкаў, кіраўнікоў калектываў, актораў захаваны некаторыя касцюмы (некалькі касцюмаў да фільма «Дзікае палявання караля Стаха», касцюмы да пастановак «Харошак», касцюм Стэфаніі Станюты да спектакля «Гаральд і мод», касцюмы Уладзіміра Мулявіна), якія сёння дэманструюцца ў музейных экспазіцыях (Музей тэатральнай і музычнай культуры і інш.), на выставах. Але ў большасці эскізы дэкарацый, сцэнічныя касцюмы захоўваюцца ў саміх мастакоў (майстэрні Ю. Піскуна, А. Герасімовіч і многіх іншых) і не набываюцца музеямі Беларусі.

Кожны з пералічаных відаў тэкстыльнага мастацтва Беларусі патрабуе асобнага вывучэння і каталагізацыі. Прапануем каталог тэкстыльных твораў Сярэднявечча з калекцыі Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурная музея-запаведніка (табліца).

**Каталог тэкстылю Сярэднявечча**
**Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка**

<table>
<tr><th>№</th><th>Выява</th><th>Від вырабу, датыроўка</th><th>Матэрыял, памеры</th><th>Колер</th><th>Тэхніка выканання</th></tr>
<tr><td rowspan="3">1.</td><td rowspan="3"></td><td>Фрагмент тканіны<br>XII – пач. XIII ст.</td><td>Воўна</td><td>Двухкаляровая.<br>Светла- і цёмна-карычневыя паласы шырынёй 2,5 см</td><td>Іголкавае пляценне</td></tr>
<tr><td>Аздоба</td><td>Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)</td><td>№ па КП, КДФ</td><td>Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення</td></tr>
<tr><td>–</td><td>Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Полацкі краязнаўчы музей.<br>Экспазіцыя</td><td>КП5-2334/31</td><td>1961 г. Полацк,<br>Верхні замак. Раскопкі пад кір. Г.В. Штыхава</td></tr>
<tr><td rowspan="3">2.</td><td rowspan="3"></td><td>Фрагмент тканіны<br>XI – XII стст.</td><td>Воўна, метал (бронза).<br>5,0 × 7,0 см</td><td>Карычнева-зеленаваты</td><td>Простае саржавае</td></tr>
<tr><td>Аздоба</td><td>Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)</td><td>№ па КП, КДФ</td><td>Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення</td></tr>
<tr><td>Цыліндрычныя бронзавыя колцы шырынёй 1 – 0,7 см</td><td>Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Фонды</td><td>КП4-2238/34</td><td>З Віцебскага абласнога краязнаўчага музея</td></tr>
<tr><td rowspan="3">3.</td><td rowspan="3"></td><td>Фрагмент тканіны або стужкі. XI – XII стст.</td><td>Воўна, метал (бронза).<br>6,0 × 9,0 см</td><td>Барвовы, жоўты, цёмна-зелёны, цёмна-сіні</td><td>?</td></tr>
<tr><td>Аздоба</td><td>Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)</td><td>№ па КП, КДФ</td><td>Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення</td></tr>
<tr><td>Спіралепадобныя прывескі, 8 – 9 кален.<br>Дыяметр 0,6;<br>даўжыня 3 – 4 см</td><td>Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Фонды</td><td>КП4-2238/34</td><td>З Віцебскага абласнога краязнаўчага музея</td></tr>
</table>

*Працяг табліцы*

| № | Выява | Від вырабу, датыроўка | Матэрыял, памеры | Колер | Тэхніка выканання |
|---|---|---|---|---|---|
| 4. |  | Фрагмент тканіны.<br>XIII – XIV стст. | Воўна | Шэры | Простае палатнянае<br>(падобна на «часціну») |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення** |
| | | | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Фонды | КВФ2-78/1 | 1979 г. Полацк, Сафійскі сабор, паўночна-заходні бок, шурф 2. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |
| 5. |  | Фрагмент тканіны.<br>XIII – XIV стст. | Воўна | Шэры | Простае палатнянае<br>(падобна на «часціну») |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення** |
| | | | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Фонды | КВФ2-78/2 | 1979 г. Полацк, Сафійскі сабор, паўночна-заходні бок, шурф 2. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |
| 6. |  | Фрагмент тканіны.<br>XIII – XIV стст. | Воўна | Шэры | Простае палатнянае<br>(падобна на «часціну») |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення** |
| | | | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Фонды | КВФ2-78/3 | 1979 г. Полацк, Сафійскі сабор, паўночна-заходні бок, шурф 2. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |

*Працяг табліцы*

| № | Выява | Від вырабу, датыроўка | Матэрыял, памеры | Колер | Пляценне |
|---|---|---|---|---|---|
| 7. |  | Фрагмент тканіны.<br>XIII – XIV стст. | Воўна | Шэры | Простае палатнянае (падобна на «часціну») |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання (музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі, спосаб паступлення** |
| | | | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. Фонды | КВФ2-78/4 | 1979 г. Полацк, Сафійскі сабор, паўночна-заходні бок, шурф 2. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |
| 8. |  | Фрагмент тканіны.<br>XIII – XIV стст. | Воўна | Шэры | Простае палатнянае (падобна на «часціну») |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання (музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі, спосаб паступлення** |
| | | | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік. Фонды | КВФ2-78/5 | 1979 г. Полацк, Сафійскі сабор, паўночна-заходні бок, шурф 2. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |

*Заканчэнне табліцы*

| № | Выява | Від вырабу, датыроўка | Матэрыял, памеры | Колер | Пляценне |
|---|---|---|---|---|---|
| 9. |  | Фрагменты тканіны.<br>XIII – XIV стст. | Воўна.<br>Агульны памер<br>фрагментаў 30 – 22 см | Шэры | Простае палатнянае<br>(падобна на «часціну») |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення** |
| | | | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Фонды | КВФ2-78/1-6 | 1979 г. Полацк, Сафійскі сабор, паўночна-заходні бок, шурф 2. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |
| 10. |  | Тканіна з гафтаваным тэкстам. XVI ст. | Шоўк.<br>Металічная і шаўковая нітка.<br>Бліскаўкі 22 × 14 × 0,2 см | Тканіна – бардо.<br>Ніці гафта – жоўта-карычневыя | Складанае палатнянае.<br>Гафт пакладзеным шыўком |
| | | **Аздоба** | **Месца захавання<br>(музей, экспазіцыя, прыватны збор)** | **№ па КП, КДФ** | **Час, месца знаходкі,<br>спосаб паступлення** |
| | | Гафт металічнымі і шаўковымі ніцямі | Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік.<br>Сафійскі сабор.<br>Экспазіцыя | КПЗ-220 | 1978 г. Полацк,<br>Сафійскі сабор. Раскопкі пад кір. В.А. Булкіна |

**Заключэнне.** Стварэнне каталогаў (у тым ліку электронных) дазволіць грунтоўна даследаваць і прааналізаваць многія пытанні, звязаныя з гісторыяй тэкстылю і касцюма, што ў сваю чаргу паспрыяе развіццю беларускага мастацтва і культуры. Некаторыя групы тэкстыльных твораў мастацтва, у першую чаргу традыцыйныя беларускія ручнікі і народны строй, на працягу стагоддзя з'яўляюцца тэмай даследаванняў. За гэты час створаны падрабязныя каталогі, прысвечаныя народнаму мастацкаму тэкстылю. Сцэнічнае ўвасабленне беларускага традыцыйнага строю стала тэматыкай даследаванняў толькі дзесяцігоддзе таму, і ў выніку сцэнічныя касцюмы і іх эскізы, якія захоўваюцца ў музейных зборах і асабістых архівах мастакоў-мадэльераў, ужо часткова каталагізаваныя. Найменш даследаваныя тэкстыльныя творы X – XVIII стагоддзяў, якія зберагаюцца ў шматлікіх музейных экспазіцыях і сховішчах, фондах НАН Беларусі. Каталагізацыя гэтых твораў тэкстыльнага мастацтва дапаможа зрабіць іх мастацтвазнаўчы аналіз, правесці параўнаўчыя даследаванні, высветліць месца беларускага тэкстыльнага мастацтва і ткацкай вытворчасці ў еўрапейскім кантэксце, удакладніць шляхі імпарту, экспарту і рээкспарту тэкстыльнай прадукцыі ў розныя стагоддзі. Электронныя каталогі дапамогуць віртуальнаму вяртанню на радзіму многіх помнікаў мастацкага тэкстылю, у тым ліку слуцкіх паясоў, габеленаў. Прафесійна пададзеныя ў каталогах, падрабязна даследаваныя ў манаграфіях творы тэкстыльнага мастацтва ўвойдуць у культурны і мастацкі ўжытак, што ў сваю чаргу дазволіць пераасэнсаваць і абнавіць музейныя экспазіцыі, будзе спрыяць папаўненню тэкстыльных калекцый, стымуляваць стварэнне новых тэматычных збораў.

ЛІТАРАТУРА


1. Арнаменты Падняпроўя / аўт. тэксту Г.Р. Нячаева [і інш.]; навук. рэд. Я.М. Сахута; фота А.В. Чыжова, Г.Р. Нячаевай. – Мінск: Беларус. навука, 2004. – 606 с.
2. Барвенава, Г.А. Тэкстыль Сярэднявечча на землях Беларусі / Г.А. Барвенава. – Мінск: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 246 с.
3. Беларускія народныя тканіны ў зборы Дзяржаўнага мастацкага музея БССР: каталог. – Мінск: Беларусь, 1979. – 255 с.
4. Веткаўскі музей народнай творчасці. – Мінск: Беларусь, 1994. – 167 с.
5. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII – XVIII стагоддзяў: альбом / аўт. тэксту і склад. Н.Ф. Высоцкая. – Мінск: Беларусь, 1984. – 235 с.
6. Київський музей історичних коштовностей. – Київ: Мистецтво, 1974. – 194 с.
7. Лабачэўская, В.А. Повязь часоў – беларускі ручнік / В.А. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2009. – 299 с.
8. Лобачевская, О.А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О.А. Лобачевская, З.И. Зимина. – Минск: Беларус. навука, 2009. – 279 с.
9. Музей старажытнабеларускай культуры. – Мінск: Беларусь, 2004. – 283 с.
10. Паншына, І.М. Музей беларускага народнага мастацтва [выяўленчы матэрыял] / І.М. Паншына. – Мінск: Беларусь, 1983. – 190 с.
11. Раманюк, М.Ф. Беларускае народнае адзенне / М.Ф. Раманюк. – Мінск: Беларусь, 1981. – 222 с.
12. Ручнік у калекцыі Брэсцкага музея: каталог / склад. В. Новікава. – Брэст, 1999. – 111 с.
13. Сахута, Я.М. Беларускае народнае мастацтва / Я.М. Сахута. – Мінск: Беларусь, 1980. – 155 с.
14. Селівончык, В.І. Ткацтва на дошчачках / В.І. Селівончык. – Мінск: Медысонт, 2009. – 64 с.
15. Тарасенко, В.Р. Отчёт о археологических раскопках на минском Замчище за 1948 год / В.Р. Тарасенко // Архив Института истории НАН Беларуси. – Д. 294. – С. 10 – 33.
16. Фадзеева, В.Я. Беларускі ручнік / В.Я. Фадзеева. – Мінск: Полымя, 1994. – 327 с.
17. Biedrońska-Słotowa, B. Za modą przez wieki. Ubiory z kolekcji Muzeum Narodowego w Krakowie / B. Biedrońska-Słotowa, J. Kowalska. – Kraków, 2003. – 118 s.
18. Drążkowska, A. Odzież grobowa w Rzeczypospolitej w XVII i XVIII wieku / A. Drążkowska. – Toruń: Wydawnictwo Naukowe Uniwersytetu im. M. Kopernika, 2008. – 340 s.
19. Herman, R. Wykorzystanie elektronowej mikroskopii skaningowej i spektroskopii absorpcyjnej w podczerwieni do określania surowca zwęglonych tkanin wykopaliskowych / R. Herman, H. Wrzosek // Kwartalnik historii kultury materialnej. – Warszawa, 2005. – № 1. – S. 71 – 83.
20. Kenig, P. Muzeum Techniki i Włókiennictwa w Bielsku-Białej: zarys dziejów bielskiego przymysłu i przewodnik po ekspozycji włókienniczej / [teksty Piotr Kenig, Wioletta Stysińska]. – Bielsko-Biała: Muzeum, 2008. – 222 s.
21. Konserwacja tkanin zabytkowych. Grupa Robocza Krajów Socjalistycznych d/s konserwacji zabytków historii, kultury i muzealiów. – Warszawa: Predprijatiem restavracii pamjatnikov «Warexpo», 1988. – 48 s.
22. Mienicka, B. Haft tkacki w zbiorach Muzeum Historii Włókiennictwa / B. Mienicka // Centralne Muzeum Włókiennictwa. – Lódź, 1976. – S. 5 – 45.

23. Musée national du Moyen Age. Thermas de Cluny. – Paris: Réunion des museés nationaus, 1993. – 192 s.
24. Orlińska-Mianowska, E. Modny świat XVIII i początku XIX wieków. Skarby muzeum / E. Orlińska-Mianowska. – Warszawa: Muzeum Narodowy w Warszawie, 2004. – 222 s.
25. Otavsky, K. Alte gewebe und ihre geschichte / K. Otavsky. – Abegg-Stiftung Riggisberg, 1987. – 136 s.
26. Pikulski, A. Mitra. Studium historyczno-artystyczne / A. Pikulski. – Lublin: Towarzystwo naukowe KUL, 2002. – 186 s.
27. Skarbiec Katedry Wileńskiej. Zamek Królewski w Warszawie 2.07–28.09.2008. Zamek Królewski na Wawelu 15.10 – 15.01.2009. Katalog wystawy. – Warszawa: Muzeum Narodowy w Warszawie, 2008. – 333 s.
28. Wawel 1000 – 2000. Kultura artystyczna dworu królewskiego i katedry – Katedra krakowska – biskupia, królewska, narodowa. Katalog. – Kraków: ANTYKWA, 2000. – T. 1. – 359 s.
29. Wawel 1000 – 2000. Kultura artystyczna dworu królewskiego i katedry. Katedra krakowska – biskupia, królewska, narodowa. Skarby archidiecezji krakowskiej. Ilustracje. – Kraków: ANTYKWA, 2000. – T. 3. – 557 s.
30. Wawel 1000 – 2000. Skarby archidiecezji krakowskiej. Katalog. – Kraków: ANTYKWA, 2000. – T. 2. – 291 s.
31. Wilkus, K. Odkrycie grobów królewskich w Katedrze wileńskej / K. Wilkus // Studia do dziejów Wawelu. – Krarów, 1991. – T. 5. – S. 530 – 549.

*Пастуніў 17.11.2010*

## CATALOGING OF THE TEXTILE ART WORKS OF BELARUS
### (ISSUES AND PERSPECTIVES)

***A. BARVENAVA***

*Cataloging of works of the textile art – from archeologic fabric fragments, preserved fibre patterns and medieval weaving devices to the XX century clothing ensembles – enebles to trace the influence weaving on the developmental process art of Belarus, at large to facilitate theoretical examination, popularization and increase of knowledge about Belorussian material, artistic and spiritual culture by means of explanation of high artistic value of textile memorials. Works of artistic textiles from Belorussian museum collections in the article are destinguished into groups and types, issues of their exhibition and preservation are depicted. Analysis of showpieces from museum collections and text messages combined with written and iconographic sources allows to trace genesis, to study typology, to interpret symbolics and semantics of Belorussian textile art of the past millenium. Scientific investigation of the medieval textile traditions enables their rethinking, helps to trace succession in the following centuries.*